# ИСТОРИЯ
# HISTORY

УДК 947.2:323.311

**А. А. Дамарад**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

## «РАЗБОРЫ» ШЛЯХТЫ ЯК СРОДАК ДЗЯРЖАЎНАЙ САСЛОЎНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Артыкул прысвечаны дзяржаўнай палітыцы ў Расійскай імперыі XIX ст., накіраванай на змяншэнне колькасці прадстаўнікоў дваранскага саслоўя ў заходніх губернях. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай вялікая колькасць шляхты папоўніла шэрагі падданых расійскай кароны. Аднак традыцыі палітычнай анархіі і гаспадарчага заняпаду рабілі яе небяспечнай ў сацыяльна-палітычным плане. Падзеі першай паловы XIX ст. паказалі, што гэтая група насельніцва Беларусі не ўпісваецца ў дваранства і нават пагражае спакою ў дзяржаве. Таму ўлады Расійскай імперыі вымушаны былі праводзіць палітыку «разбораў» шляхты напрацягу дзесяцігоддзяў. Разглядаюцца прычыны і матывы, асаблівасці, эвалюцыя адносін да нетытулаванага дваранства на тэрыторыі Беларусі і Украіны. Падсумоўваюцца статыстычныя звесткі і вынікі палітыкі па скарачэнні шляхты.

**Ключавыя словы:** дваранства, дзяржаўная палітыка, сацыяльны статус, дакументы, законы.

**Для цытавання:** Дамарад А. А. «Разборы» шляхты як сродак дзяржаўнай саслоўнай палітыкі ў Расійскай імперыі // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2022. № 1 (257). С. 5–10.

**A. A. Damarad**
Belarusian State Technological University

## "TAKING APART" OF THE NOBILITY AS A MEANS OF STATE CLASS POLICY IN THE RUSSIAN EMPIRE

The article is devoted to the state policy in the Russian Empire of the 19th century, aimed at reducing the number of representatives of the nobility in the western provinces. After the partition of the Commonwealth, a large number of gentry joined the ranks of the subjects of the Russian crown. However, the traditions of political anarchy and economic decline made it dangerous in socio-political terms. The events of the first half of the 19th century showed that this group of the population of Belarus does not fit into the nobility and even threatens peace in the state. Therefore, the authorities of the Russian Empire were forced to pursue a policy of "taking apart" of the nobility for decades. The reasons and motives, features, evolution of attitudes to the untitled nobility on the territory of Belarus and Ukraine are considered. The statistics and results of the policy of reducing the nobility are summarized.

**Key words:** nobility, public policy, social status, documents, laws.

**For citation:** Damarad A. A. "Taking apart" of the nobility as a means of state class policy in the Russian empire. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2022, no. 1 (257), pp. 5–10 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Атрымаўшы ў падданства насельніцтва усходняй часткі былой Рэчы Паспалітай, урад Расійскай імперыі сутыкнуўся са шляхецкім пытаннем. Галоўным у ім была не праблема вернасці шляхты расійскай кароне, а праблема вялікай колькаснай дыспрапорцыі. Мясцовае вышэйшае саслоўе значна пераўзыходзіла па сваёй колькасці само расійскае дваранства. Справа ў тым, што, прысягаючы на вернасць царскай уладзе, мясцовая шляхта ў масавым парадку дэманстравала свой лаялізм, падмацаваны страхам страціць тое, у асноўным невялікае, багацце, якім яна валодала. Хрэстаматыйным стаў прыведзены У. М. Ігнатоўскім адрас мясцовай шляхты расійскаму ўраду: «Живя не в Польше, мы чувствуем себя как-бы в Польше и даже лучше, чем в настоящей Польше» [1, с. 166–167].

**Асноўная частка.** Прызнанне за такой вялікай колькасцю лаяльных асоб дваранскіх правоў у прынцыпе пагражала нарадзіць сітуацыю, калі ўласнае расійскае дваранства магло растварыцца сярод учорашней «польской шляхты». Паводле ацэнак даследчыкаў XIX ст., суадносіны паміж працэнтам шляхецкага насельніцтва ў літоўска-беларускіх і ўнутраных расійскіх губернях былі вельмі і вельмі на карысць першага. Толькі па «літоўскіх» (Віленскай, Гродзенскай) і «беларускіх» (Магілёўскай, Мінскай і Віцебскай) губернях шляхта ў 40-я гг. XIX ст. складала каля 200 тыс. чалавек і па гэтым паказчыку амаль даганяла ўсё расійскае дваранства ў цэлым. Калі ўлічваць таксама шляхту ўкраінскіх губерняў, то атрымліваецца, што па колькасным паказчыку шляхта былой Рэчы Паспалітай пераўзыходзіла астатняе дваранства Расійскай імперыі амаль на 150 тыс. чалавек. Улічваючы былы вопыт па інтэграцыі ў расійскае дваранства, напрыклад, грузінскай знаці і зразумеўшы яе недахопы, калі сукупнасць княскіх родаў Расійскай імперыі зрабілася ледзь не напалову грузінскай па паходжанні, улады не жадалі паўтарэння памылак, якія б пагражалі размыццём асноўнай апоры расійскага абсалютызму. Спрыяла гэтаму і выразная дыферэнцыяцыя шляхты на дробную, пасесіённую і магнатаў. Каля 40% шляхты адносілася да так званай «загонавай», якая не мела прыгонных, а 55% – не мела зямлі. Зразумела, што такое становішча не магло задавальняць цэнтральныя расійскія ўлады, паколькі, як паказала практыка першай паловы XIX ст., гэтая група шляхты не выконвала прадугледжаных дзяржавай сацыяльных функцый і часта ператваралася ў базу для антыўрадавых выступленняў.

Гледзячы на шляхту беларускіх зямель як на рускую па паходжанні, але польскую па духу, ўрад, відавочна, не жадаў распаўсюджвання ідэй польска-шляхецкай анархіі ў асноўнай частцы дзяржавы. В. В. Ключэўскі, характарызуючы падзелы Рэчы Паспалітай, пісаў, што Расія «не присвоила ничего исконно польского, отобрала только свои старинные земли да часть Литвы, некогда прицепившей их к Польше» [2, с. 295]. Сама імператрыца Кацярына II асабіста неаднаразова падкрэслівала, што ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі не было далучана нават маленькага кавалка польскай зямлі. Напрыклад, сцвярджалася, што «не толькі ў Полацку, але і ва ўсёй Літве ўсе справы ва ўсіх судах у XVII ст. вяліся на рускай мове, што гады адзначаліся ад стварэння па грэцкаму вылічэнню, што цэрквы іх былі звычайна будаваны алтаром на ўсход» [3, с. 73]. Аднак неабходна падкрэсліць, што вышэйшы стан тагачаснага мясцовага грамадства ў асноўнай сваёй масе спавядаў рыма-каталіцызм і не вылучаў сябе з польскай культуры. У канцы XVIII ст. улады звярталі ўвагу на гэтую акалічнасць, але не праводзілі ніякай абмежавальнай палітыкі да каталіцкай шляхты. Звяртаючыся да сваіх новых падданых, Кацярына II абяцала, што «свабоднае веравызнанне ад продкаў набытае... ў цэласнасці захаваныя будуць» [4, с. 147]. Паводле урадавых звестак, праваслаўнымі былі прыблізна толькі дзве тысячы шляхціцаў, але іхняя беднасць не дазваляла ім ўплываць на жыццё ў губернях праз сістэму дваранскіх выбараў [5, с. 61].

Была пакінута за шляхтай і такая выключна дзяржаўная манаполія, як права на вінакурэнне, што зусім супярэчыла расійскім парадкам. Не ўводзіліся абмежаванні і на ўжыванне польскай мовы. У прыватнасці, у паседжанні павятовага суда ў 1798 г. пратакол вёўся на польскай мове. Прычым упісаныя ў яго вытрымкі з прывілея на маёнтак XVII ст. былі перакладзены са старабеларускай мовы на польскую [6, л. 86, 88]. Нават у складанні спраў аб дваранскім паходжанні выкарыстоўвалася польская мова. Напрыклад, у радаводнай справе Кантрымаў, складзенай у 1800 г., абсалютна ўсе дакументы былі прадстаўлены па-польску [7]. Дэкларавала Кацярына II і захаванне старой выбарнай судовай сістэмы ў «беларускіх» губернях [8, с. 26]. Нягледзячы на нерашучыя меры дзяржавы па ўніфікацыі судоў з расійскімі, канчаткова гэтыя крокі ўладаў далі вынік толькі ў 30-я гг. XIX ст. Паводле закона ад 30 кастрычніка 1831 г. усё справаводства было пераведзена на рускую мову, а земскія і гродскія суды былі пераўтвораны ў павятовыя.

Улады ўвогуле імкнуліся да ліквідацыі адрозненняў паміж карэннымі і новадалучанымі тэрыторыямі. Але на апошніх гэты працэс, часам, набываў вельмі адмысловы характар. Назіралася фактычнае прыстасаванне старых службовых і прыдворных пасадаў і званняў, якія існавалі ў былой Рэчы Паспалітай, да чыноў расійскіх. Напрыклад, яшчэ ў 1780 г. Кацярынай II суддзі Магілёўскага і Полацкага верхніх земскіх судоў І. Храпавіцкі, П. Багамолец, К. Вяшчынскі былі надзелены чынам стацкага саветніка, а засядацелі гэтых судоў – калежскага саветніка [9, с. 49].

У адносінах да мясцовай арыстакратыі палітыка была зразумелай: прыцягнуць яе на свой бок і ператварыць у правадыра імперскай палітыкі, накіраванай, у прынцыпе, на нівеліроўку мясцовых асаблівасцяў. Адным з вынікаў яе з'явілася фактычна поўнае захаванне ранейшых пазіцый, якія былі ў тытулаваных родаў у літоўскіх і беларускіх губернях. Але ў адносінах да нетытулаванай шляхты праявіўся зусім іншы падыход. З першых гадоў панавання Санкт-Пецярбурга на беларускіх землях ажыццяўляецца палітыка па наўмысным скарачэнні абсалютнай

колькасці прадстаўнікоў гэтага саслоўя. Выклікана гэта было адзначанымі вышэй аб'ектыўнымі прычынамі. Высветлілася таксама, што шмат хто жадаў выкарыстаць дваранскія правы ў сваіх асабістых мэтах (не плаціць падаткі, валодаць свабодай перамяшчэння і г. д.). Першыя ж рэвізіі паказалі, што ў дваранскае саслоўе трапіла вялікая колькасць асоб, якія шляхціцамі раней ўвогуле не з'яўляліся. Так сталася па прычыне неразумення ў першыя гады расійскай улады мясцовых асаблівасцяў. Напрыклад, рэвізія 1811 г. выявіла, што да шляхецкага стану запісана каля 200 тыс. чалавек з іншых саслоўяў толькі таму, што яны размаўлялі па-польску і былі рымакаталіцкага веравызнання. З іншага боку, не ўсе асобы, што мелі дваранскія правы, былі запісаны дваранамі [3, с. 56].

Таму, на наш погляд, працэс, які атрымаў назву «разбор» шляхты, быў па сваёй сутнасці аб'ектыўна непазбежны. Ён быў накіраваны не супраць ўсяго шляхецтва, а толькі супраць дробнай шляхты, якая новым расійскім крытэрыям і ўяўленням аб дваранстве ў сваёй масе, відавочна, не адпавядала. Да гэтай групы насельніцтва адносілі тых, хто ўвогуле не валодаў ні прыгоннымі, ні зямлёй [10, с. 115]. З вобразнага выразу В. В. Ключэўскага, яшчэ з эпохі Пятра I у Расійскай імперыі дваранскае саслоўе «старалось подчищаться, стряхивая с себя прилипавшие к нему сторонние элементы» [2, с. 332].

Практычныя крокі ўладаў па абмежаванні ўдзелу незаможнай шляхты ў дваранскіх выбарах былі пакладзены яшчэ ў 1773 г., калі быў устаноўлены фіксаваны маёмасны цэнз. Закон увогуле не дапускаў да ўдзелу ў дваранскіх выбарах тых прадстаўнікоў шляхты, якія не служылі на расійскай службе або атрымалі замежныя тытулы і ўзнагароды. Гэтым ад карыстання саслоўнымі прывілеямі адсякалася тая частка шляхты, наконт лаяльнасці якой да самадзяржаўя былі пэўныя сумненні.

Новы імператар Аляксандр I увогуле праводзіў вельмі асцярожную палітыку ў адносінах да дваранства заходніх губерняў, паколькі спадзяваўся знайсці ў ім непасрэдную палітычную апору. Відаць, менавіта гэтым можна растлумачыць падтрымку расійскім імператарам нават спадзяванняў некаторай часткі шляхты (найперш арыстакратыі) на аднаўленне дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай. Але агульнай дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да дробнай шляхты ён не змяніў, паслядоўна абмяжоўваючы яе ўдзел у дваранскіх выбарах.

Аляксандр I не спыніўся нават перад істотным памяншэннем колькасці падатнага насельніцтва. Ім было санкцыянавана права даказваць сваю прыналежнасць да дваранства тым асобам, якія былі запісаны ў аднадворцы. Гэта прадугледжвалася знакамітым маніфестам пачатку царавання Аляксандра I ад 2 красавіка 1801 г. Фактычна кола прэтэндэнтаў на «сопричисление» да вышэйшага саслоўя імперыі пашыралася даволі істотна. Але пазней гэтая ільгота на практыцы скасоўвалася. У дваранстве пакідалі толькі тых, хто быў прыпісаны да гэтага саслоўя па складу на 1795 г. Астатнім асобам адпаведна з указам Сената ад 20 студзеня 1816 г. прадпісвалася пацвярджаць сваё паходжанне дакументамі. Напрыклад, у 1819 г. паштальён Мінскай губернскай паштовай канторы Антон Тамашэвіч звярнуўся ў мясцовы Дваранскі дэпутацкі сход з прашэннем зацвердзіць яго ў шляхецтве [11, л. 2]. Адзіным дакументам, які пацвярджаў яго паходжанне, было пасведчанне з месца службы, дзе наконт яго згадваецца: «из дворян Антону Томашевичу дано сие согласно прошению его в том, что он продолжая в сей конторе служение свое 1815 г. июля с 17 числа, в худых поступках замечен не был, и когда пожелает от оной уволится, в том никакого препятствия иметь не может» [11, л. 13]. Зразумела, што ён і яго сям'я не былі зацверджаны ў дваранстве. Тое самае стала і з Карповічамі, якія пачалі працэс даказвання свайго дваранскага статусу ў 1817 г. Аднак і ў гэтым выпадку ўлады становучага рашэння не прынялі, паколькі дакументы аб паходжанні Карповічаў таксама былі страчаны, а прыгоннымі яны не валодалі [12, л. 3, 8].

На думку Т. Лепкоўскага, на гэтых землях шляхта надавала польскі характар значнай часткі як Беларусі, так і Валыні. Даследчык лічыць, што мясцовае дваранства праяўляла пасіўны пратэст супраць расійскай дзяржавы і практычна не прымала ўдзелу ў яе дзейнасці. Але разам з тым ён прызнае, што апазіцыя Расійскай імперыі была вельмі слабая, паколькі эканамічная сітуацыя спрыяла задаволенасці шляхты сваім становішчам, і яна не адчувала сябе прыгнечанаю [13, с. 182]. Сапраўды, пра адсутнасць абмежаванняў нацыянальнага характару для шляхты сведчыць і той факт, што пры ўнясенні шляхты ў губернскія радаводныя кнігі яна ўпісваліся менавіта ў шостыя іх часткі без увагі на «польскае» ці «рускае» паходжанне, каталіцкае ці праваслаўнае веравызнанне. Гэта значыць, што мясцовае дваранства разглядалася афіцыйнымі ўладамі як старажытнае рускае.

Прыход да ўлады імператара Мікалая I у 1825 г. стаў пачаткам новага этапу ў грамадскім і дзяржаўным жыцці Расійскай імперыі. Звычайна перыяд 1825–1855 гг. характарызуецца ў гістарыяграфіі як рэакцыйны.

Галоўнымі захадамі самадзяржаўя, якія паўплывалі на працэс інтэграцыі шляхты ў склад дваранства Расійскай імперыі, стаў указ ад 19 кастрычніка 1831 г. «О разборе шляхты

в западных губерниях и об устройстве сего рода людей» і спецыяльнае распараджэнне аб выбарах у заходніх губернях 1835 г.

Указ 19 кастрычніка 1831 г. замацоўваў ускладнены двухступенны парадак пацверджання дваранскіх правоў шляхтаю спачатку ў Дваранскіх дэпутацкіх сходах, а затым у Герольдыі Сената. Тым, хто здолеў пацвердзіць сваё дваранства, гарантаваліся ўсе правы і перавагі дваранства Расійскай імперыі. Для тых прадстаўнікоў шляхты заходніх губерняў, якія не даказалі дваранства, спецыяльна быў створаны новы грамадскі стан аднадворцаў заходніх губерняў. Як змянілася колькасць шляхты ў былых «літоўскіх» губернях адпаведна з новым парадкам, бачна з табліцы.

**Дынаміка колькаснага складу дваранства ў «літоўскіх» губернях (1795–1834)**

| Губерня | Колькасць дваран мужчынскага полу | |
|---|---|---|
| | 1795 г. | 1834 г. |
| Мінская | 23 470 | 35 110 |
| Віленская | 24 889 | 24 887 |
| Гродзенская | 11 538 | 23 225 |

Змены, якія прынесла мікалаеўская палітыка ў адносінах да шляхты, таксама нельга разглядаць як праяву нацыянальнай дыскрымінацыі. Манарх сваімі дзеяннямі толькі пачаў абмяжоўваць сепаратысцкія ўплывы ў дзяржаве. Значна больш жорстка дзейнічалі ў гэтым плане ўлады Прусіі і Аўстрыі. Так, у Прусіі з пасады намесніка Вялікага княства Пазнанскага быў зняты Антоній Радзівіл, а замест яго на пост обер-прэзідэнта правінцыі прызначаны этнічны немец Эдуард Флотвель. У Аўстрыі частка шляхты на чале з намеснікам Галіцыі графам Агенорам Галухоўскім-старэйшым безвынікова шукала шляхоў кампрамісу з Венай у нацыянальным пытанні [14, с. 325, 337].

Ілюстрацыяй іншых бакоў «разбораў» шляхты можа стаць справа Фларыяна Васілеўскага. Гэты шляхціц у сувязі з пераездам у Віцебскую губерню у 1830 г. звярнуўся «do deputacyi wywodowej» Мінскай губерні, дзе прасіў выдаць дакументы на дваранства. Там жа ён растлумачыў, што разам з братамі Вінцэнтам і Пятром валодае фальваркам Сіваковы, а іх бацька паводле рэвізіі 1795 г. быў запісаны ў лік ваколічнай шляхты і ніколі падушнымі падаткамі абкладзены не быў [15, л. 1]. Можна сцвярджаць, што карыстанне правамі дваранства гэтай фаміліяй на працягу больш чым трыццаці гадоў было цалкам законным (згадаем закон, які дазваляў не даказваць сваё шляхецкае паходжанне ў выпадку праходжання па рэвізіях у складзе дваранскага саслоўя не пазней 1795 г.), але з іншага боку гэткія абставіны прывялі да таго, што першае рашэнне губернскага дваранскага дэпутацкага сходу аб прызнанні за гэтымі Васілеўскімі правоў на дваранства было прынята толькі ў 1830 г. Справа ўскладнілася тым, што ў сувязі з пераменай месца жыхарства Віцебскі губернскі дваранскі сход вымушаны быў весці перапіску з Мінскім. У выніку да канца 1830-х гг. да Герольдыі не дайшлі дакументы аб шляхецтве гэтага роду, а пасля іхняга разгляду ў Санкт-Пецярбурзе Васілеўскія былі пазбаўлены дваранскіх правоў, паколькі ні разу не праходзілі па справах аб дваранскіх правах [15, л. 5, 6].

У цэлым колькасць дваранства на працягу 50 год XIX ст., нягледзячы на ўсе скарачэнні і «разборы», не толькі не паменшылася, але нават крыху ўзрасла.

Увогуле, афіцыйныя звесткі аб колькасці дваран, паводле заўвагі А. М. Лютага, недакладныя [16, с. 202]. У прыватнасці, ён адзначае, што сапраўды пятая рэвізія насельніцтва Расійскай імперыі, праведзеная ў 1796 г., значна (прыблізна на 60%) занізіла колькасць дваранства [16, с. 202]. Справа ў тым, што дваране, якія не мелі прыгонных, у рэвізіі насельніцтва не ўлічаны. Адпаведна сапраўдныя і дакладныя звесткі аб колькасці асоб шляхецкай годнасці на землях Беларусі прывесці цяжка. Са «Статыстычных табліц Расійскай імперыі» вынікае, што на 1858 г. у «літоўскіх» і «беларускіх» губернях удзельная вага дваранства заставалася самай высокай ў імперыі. Гэты паказчык складаў 6,1% у Гродзенскай, 6,0% у Віленскай, 4,7% у Мінскай, 4,2% у Магілёўскай і 3,8% у Віцебскай губернях адпаведна [17].

У той жа час, спасылаючыся на матэрыялы рэвізій, А. М. Люты прыводзіць іншыя лічбы ўдзельнай вагі дваранства Беларусі. Так, паводле падлікаў А. М. Лютага, на працягу 1796–1858 гг. у працэнтных адносінах колькасць дваранства зменшылася з 5,2 да 2,9% насельніцтва (прыблізна 99 700 асоб абодвух полаў) [16, с. 202]. Але калі ўлічыць, што сам даследчык агаворваў заніжэнне статыстычных дадзеных прыблізна на 50–60%, то ў цэлым гэтыя лічбы суадносяцца з лічбамі, прадстаўленымі вышэй.

Прыведзеныя даныя сведчаць, што нават не пацвердзіўшыя сваё шляхецтва асобы на практыцы карысталіся дваранскімі правамі на працягу многіх і многіх гадоў. Насуперак існуючаму агульнаімперскаму парадку, фактычна ў «беларускіх» і «літоўскіх» губернях уводзіцца асобы статус «доказывающего дворянство».

З паступовым пераходам Расійскай імперыі да капіталістычных адносін у 50–60-я гг. XIX ст. павялічваецца колькасць дваран і ў беларускіх гарадах. Асноўную іх частку складала беззямельная шляхта, якая шукала падтрымкі свайго сацыяльнага статусу на дзяржаўнай службе. Напрыклад, у 1866 г. у Магілёве пражывала

1817 спадчынных і 2461 асабістых дваран, што складала 14,6 і 47,0% ад ўсяго губернскага спадчыннага і асабістага дваранства адпаведна [18, с. 2, 7]. У выніку з 1858 да 1866 гг. колькасць дваран у Магілёве ўзрасла з 1325 да 4278 чалавек, ці на 220%. Павялічэнне колькасці дваран назіралася і ў іншых гарадах. Такі рост не толькі вёў да расслаення шляхты, але спрыяў фарміраванню рынку наёмнай працы і нават паўперызацыі гарадскога дваранства [16, с. 205].

Безумоўна, абсалютысцкая расійская манархія вымушана была праводзіць палітыку, скіраваную на ўмацаванне ўнутранага адзінства і аднастайнасці «благородного российского дворянства» як агульнадзяржаўнага саслоўя, безадносна да нацыянальнай прыналежнасці ягоных прадстаўнікоў. Гэта само па сабе патрабавала выключэння з дваранскіх шэрагаў нашай дробнай і драбнюткай чыншавай, засцянковай і загонавай шляхты. Колькасная перавага «былой польскай шляхты» ў дачыненні да карэннага расійскага дваранства была, відавочна, недапушчальная. Адпаведна гэты матыў, зусім не прага помсты за ўдзел ў паўстаннях, быў галоўнай прычынай знакамітых разбораў шляхецтва. Трэба падкрэсліць, што расійскія ўлады таксама мусілі праводзіць адпаведныя санацыйныя мерапрыемствы, літаральна чысціць шэрагі шляхецтва ад тых шматлікіх «нядобрасумленных» асоб, якія падманам упісаліся ў дваранства, карыстаючыся фальшывымі дакументамі, у першыя гады пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Нарэшце, як паказвае параўнанне стану справаў у Віленскай і Мінскай губернях, працэнт незацверджаных у дваранстве залежаў, увогуле, не столькі ад палітыкі цэнтральных уладаў, колькі ад пазіцыі мясцовых уладаў.

**Заключэнне.** Далучыўшы да Расійскай імперыі беларускія і ўкраінскія землі, афіцыйныя ўлады неаднаразова падкрэслівалі, што гэта не была анэксія. Тагачасная афіцыйная ідэалогія Расійскай імперыі тлумачыла яе поўнае права на валоданне ўсходнеславянскімі землямі. Менавіта з гэтай прычыны шляхта, якая апынулася ў расійскім падданстве, не зведала такога моцнага нацыянальнага ўціску, як тая яе частка, што трапіла ў Прускае каралеўства і Аўстрыйскую імперыю. Спробы стварыць нацыянальна-культурную аўтаномію для палякаў ў гэтых дзяржавах былі, фактычна, толькі намінальнымі. У Расійскай імперыі, у сваю чаргу, да 30-х гг. XIX ст. шляхта заходніх губерняў не толькі захоўвала поўныя правы ў судовай галіне, але і свабодна карысталася ў афіцыйных зносінах з мясцовымі органамі ўлады польскай мовай. Не было ў гэты час і рэлігійнага ўціску.

Такім чынам, можна вылучыць 2 галоўныя матывы «разбораў»:

– фіскальны, які прадугледжваў абкладанне падушнымі падаткамі дробнай шляхты, паколькі гэтая сацыяльная група не жадала выконваць свой пачэсны абавязак – служыць дзяржаве;

– «засцерагальны», які стаў крокам па страхаванні расійскага самадзяржаўя ад магчымага растварэння і асіміляцыі сярод шляхты заходніх губерняў дваран з губерняў унутраных.

**Спіс літаратуры**

1. Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск: Беларусь, 1992. 190 с.
2. Ключевский В. О. Русская история. Полный курс лекций: в 3 кн. Кн. 3. Ростов н/Д: Феникс, 1998. 576 с.
3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: Экаперспектыва, 2000–2005. Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. 2005. 518 с.
4. Емяльянчык У. П. Паланез для касінераў (З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі). Мінск: Беларусь, 1994. 160 с.
5. Rychlinkowa J. Carat wobiec polskiej szlachty na zeimiach zabranych w latach 1772–1831 r. // Kwartalnik historyczny. 1991. № 3. S. 34–57.
6. НГАБ. Ф. 686. Воп. 1. Справа 9. Актовая книга «Минский земский поветовый суд». 34 л.
7. ЛДГА. Ф. 391. Воп. 5. Спр. 794. «Родословная рода Контрымов (1800 г.)». 13 л.
8. Белоруссия в эпоху феодализма: сб. док.: в 3 т. Т. 3. Воссоединение Белоруссии с Россией и ее экономическое развитие в конце XVIII – первой половине XIX в. (1772–1860) / сост.: В. В. Чепко, В. В. Шатилло; ред. В. В. Чепко. Минск: Изд-во Акад. наук БССР, 1961. 625 с.
9. Смяховіч М. У. Адносіны самадзяржаўя да польскага насельніцтва Беларусі ў гады падзелаў Рэчы Паспалітай // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.: зб. навук. прац. Мінск: БДПУ, 1995. С. 39–54.
10. Туміловіч Г. М. Палітыка царызму ў адносінах да дробнай шляхты Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.: зб. навук. прац. Мінск: БДПУ, 1995. С. 114–128.
11. НГАБ. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 3241. «О дворянском происхождении рода Томашевичей». 12 л.
12. НГАБ. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1307. «О происхождении рода Карповичей». 18 л.
13. Lepkowski T. Narod bez panstwa // Polska: łosy państwa i narodu. Warszawa, 1992. S. 179–198.
14. Тымковский М. История Польши. М.: Весь мир, 2004. 544 с.
15. НГАБ. Ф. 319. Воп. 2. Справа 400. «О дворянском происхождении рода Василевских». 32 л.

16. Люты А. М. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст.: манаграфія. Мінск: БДПУ, 2004. 320 с.
17. Переписи населения России: итоговые материалы подворных переписей и ревизий населения России (1646–1858). М.: Наука, 1972. 573 с.
18. Статистические таблицы Могилевской губернии за 1866 год. Могилев: Губернская тип., 1867. 82 с.

## References

1. Ignatovsky V. M. *Karotki narys gistoryi Belarusi* [A short essay on the history of Belarus]. Minsk, Belarus Publ., 1992. 190 p. (In Belarusian).
2. Klyuchevskiy V. O. *Russkaya istoriya. Polnyy kurs lektsiy* [Russian history. Full course of lectures]. Book 3. Rostov-on-Don, Phoenix Publ., 1998. 576 p. (In Russian).
3. *Gistoryya Belarusi. Tom 4: Belarus' u skladzie Rasiyskay imperyi (kanets XVIII – pachatak XX st.)* [History of Belarus. Vol. 4. Belarus in the Russian Empire (late 18$^{th}$ – early 20$^{th}$ century)]. Minsk, Eka-perspektyva publ., 2005. 518 p. (In Belarusian).
4. Emelyanchik V. P. *Palaniez dlia kasinerau (Z padziey paustannya 1794 g. pad kiraunitstvam T. Kastsyushki na Bielarusi)* [Polanez for cossins (From the events of the uprising of 1794 under the leadership of T. Kosciuszko in Belarus)]. Minsk, Belarus Publ., 1994. 160 p. (In Belarusian).
5. Rychlinkowa J. Carat as a prophet of the Polish nobility in the lands taken in the years 1772–1831. *Kwartalnik historyczny* [Historical quarterly], 1991, no. 3, pp. 34–57 (In Polish).
6. NGAB. Fund 686. I. 1. F. 9.
7. LDHA. Fund 391. I. 5. F. 794.
8. *Belorussiya v epokhu feodalizma: sbornik dokumentov. Tom 3. Vossoyedineniye Belorussii s Rossiyey i yeyo ekonomicheskoye razvitiye v kontse XVIII – pervoy polovine XIX v. (1772–1860)* [Belarus in the era of feudalism: collection of documents. The reunification of Belarus with Russia and its economic development in the late 18$^{th}$ – first half of the 19$^{th}$ centuries]; coll. by V. V. Chepko, V. V. Shatillo; ed. by V. V. Chepko. Minsk, Akad. nauk BSSR Publ., 1961. 625 p. (In Russian).
9. Smyakhovich M. V. Attitudes of the autocracy to the Polish population of Belarus during the partition of the Commonwealth. *Natsyanal'naya palityka rasiyskaga samadzyarzhayya na Belarusi u kantsy XVIII – pachatku XIX st.* [National policy of the Russian autocracy in Belarus in the late 18$^{th}$ – early 19$^{th}$ century]. Minsk, BSPU Publ., 1995. Pp. 39–54 (In Belarusian).
10. Tumilovich G. M. Tsarist policy towards the petty gentry of Belarus in the late eighteenth and first half of the nineteenth century. *Natsyanal'naya palityka rasiyskaga samadzyarzhaya na Belarusi u kantsy XVIII – pachatku XIX st.* [National policy of the Russian autocracy in Belarus in the late 18$^{th}$ – early 19$^{th}$ century]. Minsk, BSPU Publ., 1995. Pp. 114–128 (In Belarusian).
11. NGAB. Fund 319. I. 2. F. 3241.
12. NGAB. Fund 319. I. 2. F. 1307.
13. Lepkowski T. A nation without a state. *Polska: łosy państwa i narodu* [Poland: the woofs of the state and the nation]. Warsaw, 1992. Pp. 179–198 (In Polish).
14. Tymkovsky M. *Istoriya Pol'shi* [History of Poland]. Moscow, Ves' mir Publ., 2004. 544 p. (In Russian).
15. NGAB. Fund 319. I. 2. F. 400.
16. Lyuty A. M. *Satsyyalna-ekanamichnaye razvittsyo u Belarusi u drugoy palove XVIII – piershay palove XIX st.* [Socio-economic development of Belarus in the second half of the 18$^{th}$ century – the first half of the 19$^{th}$ century]. Minsk, BSPU Publ., 2004. 320 p. (In Belarusian).
17. *Perepisi naseleniya Rossii: itogovyye materialy podvornykh perepisey i reviziy naseleniya Rossii (1646–1858)* [Censuses of the population of Russia: final materials of household censuses and revisions of the population of Russia (1646–1858)]. Moscow, Nauka Publ., 1972. 573 p. (In Russian).
18. *Statisticheskiye tablitsy Mogilevskoy gubernii za 1866 gogd* [Statistical tables of the Mogilev province for 1866]. Mogilev, Gubernskaya tipographiya Publ., 1867. 82 p. (In Russian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Дамарад Аляксей Анатольевіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: domorad@belstu.by

## Information about the author

**Damarad Aliaksei Anatolievich** – PhD (History), Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: domorad@belstu.by

*Паступіў 14.03.2022*